Бібліятэкі Дзяржаўнай установы культуры “Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Баранавічы” садзейнічаюць станаўленню і адраджэнню нацыянальнай культуры, вывучэнню яе гісторыі, папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны горада і раёна. Выхаваўчая функцыя сучаснай бібліятэкі накіравана на фарміраванне грамадзянска-патрыятычнай свядомасці падрастаючага пакалення, духоўных патрэбнасцяў карыстальнікаў.

Асноўныя напрамкі дзейнасці ДУК “Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Баранавічы”:

- ✓ Удасканальванне дзейнасці бібліятэк як інфармацыйных, асветніцкіх і сацыякультурных цэнтраў, іх інавацыйнае развіццё. Далейшая аўтаматызацыя тэхналагічных працэсаў у бібліятэках: развіццё ўжо існуючых тэхналогій; укараненне новых праграмных рашэнняў з мэтай павышэння эфектыўнасці, хуткасці абслугоўвання карыстальнікаў і паляпшэння доступу да інфармацыйных рэсурсаў; развіццё праграмнага забеспячэння BELMARC.

- ✓ Фарміраванне якаснага фонду ўсімі тыпамі і відамі дакументаў на розных носьбітах і забеспячэнне яго захаванасці, стварэнне ўласных інфармацыйных рэсурсаў. Забеспячэнне доступу да іх з дапамогай электроннага каталога, вэб-сайта, эталонных баз дадзеных, рэсурснага патэнцыяла Публічнага Цэнтра Прававой Інфармацыі.
- ✓ Паляпшэнне якасці, паўнаты і аператыўнасці абслугоўвання, напаўнення сацыякультурных мерапрыемстваў, павышэнне інфармацыйнай культуры карыстальнікаў.
- ✓ Развіццё камунікацый і партнёрства для павышэння аўтарытэту бібліятэк у мясцовай супольнасці: каардынацыя з установамі культуры і адукацыі, грамадскімі арганізацыямі і аб’яднаннямі, прадпрыемствамі, творчай інтэлігенцыяй, мясцовымі аўтарамі, мастакамі; ажыццяўленне пошуку сацыяльных партнёраў.

Універсальны бібліятэчны фонд на 01.01.2026 г. складае 430104 экз. дакументаў: кніг, перыядычных выданняў, электронных дакументаў і інш.

У сваёй дзейнасці публічныя бібліятэкі ДУК “ЦБС г. Баранавічы” арыентуюцца на формы і метады работы з рознаўзроставымі катэгорыямі насельніцтва. Запатрабаваным накірункам з’яўляецца дзейнасць з людзьмі з абмежаванымі магчымасцямі. Сфарміраваны фонд спецыяльнай агучанай літаратуры для людзей з аслабленым зрокам; праводзяцца адаптаваныя

сацыякультурныя мерапрыемствы. Папулярны цыкл урокаў дабрыні і міласэрнасці для людзей з асаблівасцямі развіцця – наведвальнікаў дзённага аддзялення ТЦСАН.

Прыцягваючы ўвагу да сваёй дзейнасці, калектыў ДУК "Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Баранавічы" ідзе насустрач насельніцтву, працуе па-за сценамі бібліятэкі, удзельнічае ў маштабных гарадскіх, абласных, рэспубліканскіх акцыях і праграмах, сацыяльна значымых праектах, якія накіраваны на фарміраванне станоўчай грамадскай думкі аб дзейнасці сучасных бібліятэк. Нязменнай папулярнасцю карыстаюцца ў гараджан Бібліятэкі пад адкрытым небам у межах агульнагарадскіх святаў "Масленіца", "Баранавіцкая вясна", Дзень Перамогі, Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь. Запатрабаваны інтэлектуальныя экспазіцыі ў межах праекта "Кніга ў горадзе".

У публічных бібліятэках горада праводзяцца сяты кнігі, праваслаўныя чытанні, творчыя вечарыны, мастацкія вернісажы; афармляюцца кніжныя выстаўкі, прагляды літаратуры, тэматычныя экспазіцыі; ладзяцца пасяджэнні літаратурна-творчага аб'яднання "Купальскія зоры", Дні ведаў, Таўлаеўскія чытанні і інш.

З мэтай далучэння да нацыянальнай культуры, папулярызацыі роднай мовы і літаратуры на працягу года праводзяцца шматлікія мерапрыемствы: вучэбна-пазнавальныя сустрэчы, гучныя чытанні, паэтычныя і літаратурныя імпрэзы, аўтарскія бенефісы, прэзентацыі кніг, сустрэчы з вядомымі беларускімі пісьменнікамі. З 2025 года ў цэнтральнай бібліятэцы горада рэгулярна ладзяцца творчыя сустрэчы маладзёжнай аўдыторыі з баранавіцкімі аўтарамі ў межах літаратурна-краязнаўчага партнёрскага праекта "Літаратурныя пятніцы ў "Таўлаеўцы".

Маштабнымі штогадовымі мерапрыемствамі для юных чытачоў з'яўляюцца "Тыдзень дзіцячай і юнацкай кнігі", конкурс "Лета і кніга", летнія моўныя праграмы па вывучэнню і ўдасканальванню навыкаў замежных моў, акцыі "БібліяНоч", "БібліяЗмярканне". Папулярныя сярод карыстальнікаў такія формы сацыякультурнай дзейнасці, як літаратурныя сняданкі і літаратурныя вячэры, інтэлектуальныя настольныя гульнятэкі, гучныя чытанні з выкарыстаннем методыкі каністэрапіі (са спецыяльна навучанымі жывёламі-кампаньёнамі).

Высокай адзнакай вынікаў творчай працы калектыву ДУК "Цэнтралізаваная

сістэма г. Баранавічы” з'яўляюцца нязменна прызавыя месцы ў абласных і рэспубліканскіх конкурсах прафесійнага майстэрства.

На базе Цэнтральнай гарадской бібліятэкі імя В.П. Таўлая функцыяніруе Публічны Цэнтр Прававой Інфармацыі (ПЦПІ). Згодна вынікаў II Рэспубліканскага конкурсу “Лепшы публічны цэнтр прававой інфармацыі” ў намінацыі “Лепшы ПЦПІ цэнтральнай раённай (гарадской) бібліятэкі” Цэнтральная гарадская бібліятэка імя В.П. Таўлая заняла I месца (2024 г.). У бібліятэцы штомесяц ладзяць бясплатныя юрыдычныя кансультацыі спецыялісты натарыяльных кантор горада, праводзяцца маштабныя сацыякультурныя мерапрыемствы прававасветніцкага характару з дзецьмі і моладдзю.

У межах міжнароднага супрацоўніцтва з расійскімі публічнымі бібліятэкамі праводзяцца сумесныя вэбінары, інтэрнэт-акцыі патрыятычнага напаўнення, адкрытыя ўрокі мужнасці для расійскіх школьнікаў.

Аным з асноўных відаў адукацыйнай дзейнасці бібліятэк ДУК “Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Баранавічы” з’яўляецца распрацоўка і рэалізацыя самастойных праграм дадатковай адукацыі (курсы па навучанню замежным мовам для розных груп карыстальнікаў).

Трывалае месца ў спектры бібліятэчных падзей заняла навуковая лабараторыя, дзе карыстальнікі маюць магчымасць займацца 3D-прынтэрам, 3D-ручкамі, мікраскопам, тэлескопам, акулярамі віртуальнай рэальнасці, праграмай OSMO, электроннымі канструктарамі і т.п.

Бібліятэчнымі спецыялістамі г. Баранавічы распрацаваны і ўведзены ў практыку новы фармат выдавецкіх аналітычна-метадычных комплексаў “Метадычны веснік “Баранавічы чытаючыя”. Традыцыйна выдаюцца інфармацыйныя бюлетэні “Новыя паступленні ў фонды ЦБС”, штогадовы альманах “Справы бібліятэчныя”, метадычныя рэкамендацыі да знамянальных дат літаратурнага і культурнага календара, юбілеям пісьменнікаў, рэкамендацыйныя бібліяграфічныя агляды, спісы літаратуры і г.д.

Цэнтральная гарадская бібліятэка імя В.П. Таўлая з’яўляецца адной з публічных бібліятэк Рэспублікі Беларусь, што ўдзельнічае ў Рэспубліканскім бібліятэчным кансорцыўме па аналітычнаму роспісу дакументаў LIBКАРД, а таксама ў стварэнні рэгіянальнага зводнага электроннага каталога бібліятэк Брэсцкай вобласці.

Бібліятэкі ДУК “Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Баранавічы” анансуюць сваю дзейнасць, выкарыстоўваючы інтэрнэт-пляцоўкі: афіцыйны вэб-сайт з доступам да электроннага каталогу, сацыяльныя сеткі “Баранавічы чытаючыя” ВКантакце, Фэйсбуку і Тэлеграм. Створаны аўтаматызаваныя рабочыя месцы для карыстальнікаў з доступам да сеткі Інтэрнэт.

Творчы калектыў ДУК “Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Баранавічы” не спыняецца на дасягнутых выніках, пастаянна знаходзіцца ў пошуку і рэалізацыі новых форм работы і заўсёды гасцінна сустракае сваіх карыстальнікаў.